# ЗНАК ЦІШЫНІ

Каб у класе запанавала цішыня, не абавязкова зрываць свае ўжо надарваныя галасавыя звязкі. Замест таго, каб некалькі разоў усцішваць працуючых у групах вучняў, дастаткова выкарыстаць адзін жэст, каб звярнуць на сябе ўвагу класа і пераказаць чарговыя інструкцыі.

Выправаваным знакам цішыні з’яўляецца рука настаўніка. Яго належыць увесці ў звычай наступным чынам:

1. Інфармуем клас, што ад сёння ў нас уводзіцца новае правіла.
2. Выбіраем у класе месца, з каторага будзем заўсёды падаваць сыгнал цішыні.
3. Пасля чаго распавядаем, на чым гэта правіла будзе заснавана:

*Калі настаўнік, стоячы на гэтым месцы, падыме ўгору руку, кожны, хто яе заўважыць*

*А) перастае размаўляць*

*Б) падымае ўгору сваю руку*

*В) звяртае ўвагу суседа, калі той не заўважыў знак.*

Калі настаўнік застанецца паслядоўным у сваіх дзеяннях, і ад гэтага часу не будзе інакш усцішваць клас, то пасля некалькіх дзён ён заўважыць, што правіла дзейнічае, прытым дзейнічае імгненна.

У малодшых класах базавай школы знак цішыні можна назваць правілам: “роцік на замочак, ручка ўверх”. Гэты метад дзейнічае добра ў кожнай узроставай групе і асабліва дапамагае здысцыплінаваць клас з вялікай колькасцю вучняў.

Апрацаваў на падставе метадычных матэр’ялаў IJELP і асабіста спраўдзіў Войцех Жмудзіньскі.